Крокі школьнай рэформы
Радасць творчасці

Пачалося ўсё з таго, што ўпраўленню «Магілёўэнерга» спатрэбіліся спецыяльныя замкі для трансфарматарных падстанцый і зацiскі для аўтаматычных выключальнікаў. Ніводнае прадпрiіемства горада не ўзялося за выкананне такога заказу: клопатаў шмат, а выгады амаль ніякай. Тады і звярнуліся энергетыкі за дапамогай да школьнікаў. Добрых памочнікаў знайшлі яны ў сярэдняй школе № 22 г. Магілёва. Вось ужо некалькі гадоў, як тут адкрыты вытворчы цэх, якім кіруе заслужаны настаўнік БССР С. І. Слізкі.

Кожны клас — з чацвёртага па восьмы — працуе асобнай брыгадай, якой даводзіцца сапраўднае вытворчае заданне. Ну а тыя, хто ўзростам яшчэ не выйшаў, выконваюць нескладаяыя аперацыі, пераймаюць вопыт старэйшых школьнікаў, якія і даводзяць да ладу гатовую прадукцыю. Тут кожнаму знаходзіцца справа. Сама атмасфера добразычлівасці і ўвагі да думкі кожнага дае дзецям прастору для творчасці.

Рацпрапановы і цікавыя ідэі юных вынаходнікаў «сцякаюцца» у школьнае канструктарскае бюро. Многія з іх увасобіліся ўжо ў розкыя прыстасаванні для такарных, свідравальных 1 фрэзерных станкоў. Гэтым вучні самі сабе аблегчылі работу: цяпер працей наразаецца разьба, свідруюцца адтуліны ў метале, удасканальваецца ’тзхвзлогія выканання заказаў, ствараюцца дзеючыя мадэлі машын і механізмаў. Менавіта таму і з'явілася ў школе пярвічная арганізацыя Усесаюзнага таварыства вынаходнікаў і рацыяналізатараў. І хоць школьнікі не робяць пакуль вялікіх адкрыццяў, затое кожны дзень яны адкрываюць штосьці новае ў сабе і для сябе. І гэта самае каштоўнае.

НА ЗДЫМКАХ: кіраўнік школьнага канструктарскага бюро Андрэй Шарапаў, узнагароджаны медалём «Юны ўдзельнік ВДНГ СССР»;

«Здарава!» — у захапленні малышы ад школьнай аўтатрасы, сабранай старшакласнікамі.



Тэкст і фота С. ЖАЛУДОВІЧА.